Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 17 (259) | 18 мая, 1956 года. | Цана 20 кап.

ДЗЯКУЙ ПАРТЫІ!

* * *

Клопаты аб чалавеку

Мне 62 гады. Ва універсітэце працую з 7 сакавіка 1924 г. Як бачыце, права пайсці на пенсію я меў два гады таму назад, але, адчуваючы сябе добра, працягваю працаваць, паколькі у працы заключаецца найвялікшае шчасце чалавека.

Совецкая улада высока цэніць працу простых людзей. Прыкладам гэтага з'яуляецца праект новага Закона аб дзяржауных пенсіях, у якім выражаны вялікія клопаты аб пенсіянерах.

Я, напрыклад, буду атрымліваць каля 450 рублеу пенсіі, што дасць мне магчымасць нядрэнна жыць. Цяпер і старасць мне не страшна.

Вялікае дзякуй Комуністычнай партыі і Совецкаму ураду, якія штодзённа клапоцяцца аб добрабыце чалавека.

Пінсіянер КАЗЛОЎ.

ВЯЛІКАЯ РАДАСЦЬ

З вялікай радасцю і адабрэннем сустрэла я паведамленне аб праекце Закона аб дзяржауных пенсіях. Гэта—права грамадзян на матэрыяльнае забеспячэнне у старасці.

Стаж маёй работы—35 год. Пенсію атрымліваю 150 рублёу у месяц. Цяпер я буду атрымліваць значна больш. Я ганаруся поспехамі нашай Радзімы, нашым мудрым кіраўніком—Комуністычнай партыяй.

Я даю слова Комуністычнай партыі і Совецкаму ураду, якія так клапоцяцца аб нас, старых, што буду працаваць, пакуль хопіць сіл, на карысць маёй любімай Радзімы.

А. С. ГАРБАЦЕНКА,
заг. архівам БДУ.

ГРУБАЯ ПАМЫЛКА ДЭКАНАТА

На прыродазнаучых факультэтах універсітэта пачалася летняя экзаменацыйная сесія. Першыя дні яе паказалі, што не ва усіх дэканатах правільна падыйшлі да планавання часу на падрыхтоуку да экзаменаў, што ужо выклікала ускладненне і дало зрыу экзамена.

Так адбылося на біёлага-глебавым факультэце. Студэнтам першага курса для падрыхтоукі да экзамену па асновах марксізма-ленінізма было выдзелена фактычна толькі 3—4 дні, у той час, як на падрыхтоуку да іншых экзаменаў, у прыватнасці па заалогіі, адведзена 14 дзён. Студэнты гэтага курса 9—10 мая здавалі апошні залік, а 14-га у іх запланаван экзамен. Яны прасілі павялічыць час на падрыхтоуку па асновах марксізма-ленінізма, аднак жаданне іх не было ўлічана. У выніку атрымалася, што на экзамен да прызначанага часу ніхто не прышоу—студэнты заявілі, што яны не паспелі паутарыць матэрыял.

Толькі пасля таго, як экзаменатар, кандыдат навук Н. С. Шавельская, прасядзеушы у пустой аўдыторыі 2 гадзіны, данесла аб гэтым у дэканат, некалькі студэнтаў прышло здаваць экзамен.

Дэкан біёлага-глебавага факультэта П. Г. Пятровіч спрабаваў апраудаць такое няправільнае планаванне часу у перыяд экзаменацыйнай сесіі, спасылаючыся на тое, што быццам-бы заалогія—гэта спецыяльны прадмет, гадавы курс, вельмі цяжкі і г. д. Мы не схільны прымяншаць ролі і значэння спецыяльных дысцыплін на прыродазнаўчых факультэтах. Аднак на якой аснове і з якога часу тав. Пятровіч стаў лічыць, што асновы марксізма-ленінізма—гэта малаважны і другарадны прадмет? Дарэчы сказаць, гэта таксама гадавы курс, які уключае да таго-ж спецкурс па матэрыялах XX з'езда КПСС.

Тэндэнцыя прыніжаць значэнне вывучэння грамадскіх дысцыплін, марксізма-ленінізма з'яўляецца яўна памылковай і шкоднай. А іменна такая тэндэнцыя украдваецца у спробах да крайнасці скараціць час на падрыхтоуку да экзаменаў па марксізму.

Да таго-ж трэба зауважыць, што такія спробы з'яуляюцца не упершыню. Хаця тав. Пятровіч спрабуе паказаць справу так, быццам дэканат зыходзіць з інтарэсаў студэнтаў,—самі студэнты заяуляюць, што на падрыхтоуку па марксізму-ленінізму часу вельмі мала, што яго трэба было павялічыць, некалькі скараціушы (да 9—10 дзён) час на падрыхтоуку па заалогіі. Між іншым, калі запыталі пра думку студэнтаў пры складанні раскладу,—яны іменна так і прасілі спланаваць: 7—8 дзён на першы экзамен і 8—10 дзён на наступны.

Трэба зрабіць папрок і ў адрас экзаменатара Н. С. Шавельскай, якая напярэдадні экзамена на кансультацыі выявіла памылку ў планаванні, але не паставіла рашуча пытанне перад дэканатам і навуковаи часткай аб выпрауленні яе і павелічэнні студэнтам часу на падрыхтоуку да экзамену па асновах марксізма-ленінізма.

Выпадак з біёлага-глебавым факультэтам сведчыць аб тым, што не ўсе дэканаты ўсебакова і глыбока прадумалі планіроуку работы на перыяд летняй экзаменацыйнай сесіі. Гэта выклікае неабходнасць яшчэ і яшчэ раз вярнуцца да пытання аб раскладзе летняй экзаменацыйнай сесіі і ліквідаваць, там дзе яны ёсць, падобныя памылкі ў планаванні.

Н. СЦЯПАНАЎ.

ЭКСКУРСІЯ НА ФАБРЫКУ

Студэнты другога курса аддз. геаграфіі пабывалі нядаўна на экскурсіі на мінскай кандытарскай фабрыцы «Комунарка». Яны азнаёміліся з вытворчымі працэсамі, з прыгатаваннем розных растворау.

Хутка такую-ж экскурсію зробяць студэнты групы фізгеографаў.

ЭКЗАМЕНАЦЫЙНАЯ СЕСІЯ ПАЧАЛАСЯ

Першыя поспехі Большасць—„выдатна"

* * *

У чацвертакурснікаў хімфака

З аудыторыі выбегла радасная дзяучына. Па выразу яе твару, па шырокай усмешцы няцяжка было здагадацца, якую адзнаку яна атрымала. Але яе акружылі дзяучаты і адразу наперабой закрычалі:

— Ну як?

— Выдатна,—адказала Надзя Арыка.

Да Надзі пацягнууся лес рук, кожнаму хацелася павіншаваць сяброуку.

Надзю Арыка віншавалі не першую. Перад ёй адзінаццаць аднакурснікаў атрымалі выдатныя адзнакі: Зінцова, Кауцэвіч, Станкевіч, Шауцоу і іншыя.

Толькі адна Рудакоуская стаяла і не ведала, што ёй рабіць. Яна не адказала ні на адно пытанне. Стаяла, чырванела і, мабыць, думала аб выніках. Думала, што цяпер зноу на комсамольскім сходзе будуць дакараць за дрэнныя адносіны да свайго галоунага абавязку—вучобы. Таксама-жі у мінулым семестры. Сорамна было глядзець у вочы таварышам. Тады яна атрымала дзве пасрэдныя адзнакі. І вось ужо цяпер, у самым пачатку сесіі, зноу тройка па калоіднай хіміі.

Неарганікі і арганікі здавалі экзамен па гістарычнаму матэрыялізму. З 48 чалавек 25 атрымалі выдатныя адзнакі. Сярод іх Аленіцкая, Бычкова, Кананюк і іншыя.

Тэорыю будовы арганічных злучэнняу таксама здалі нядауна чацверакурснікі. Палавіна студэнтау атрымала выдатныя адзнакі. Экзамінатар дацэнт К. А. Пячэрская засталася задаволеная адказамі.

Экзамены на хімічным факультэце прадаужаюцца.

Я. ГОМАН.

ЗДАЮЦЬ БУДУЧЫЯ ГЕОГРАФЫ

Нядауна студэнты I курса аддз. геаграфіі здавалі экзамен па асновах марксізма-ленінізма, які паказау, што будучыя географы добра працавалі на працягу усяго семестра. Яны рэгулярна рыхтаваліся да семінараў, глыбока вывучалі першакрыніцы.

А таму і не выпадкова, што 26 студэнтау атрымалі «выдатна», адказаушы на усе пастаўленыя пытанні. Пасрэдных адказау не было. Глыбокія і вычарпальныя адказы далі студэнты Абражэвіч, Аляксеева, Новікава, Парахня, Крутаус і іншыя.

І. ШКЛОЎСКІ.

ЭКЗАМЕН ПА ЗАМЕЖНАЙ МОВЕ

Яшчэ звіняць па-ранейшаму званкі на лекцыі і з лекцый, яшчэ у аудыторыях ідуць семінары і практычныя заняткі, а у некаторых студэнтау ужо пачалася экзаменацыйная сесія.

Першы экзамен па замежнай мове здавалі 10 мая другакурснікі біяфака. Ля 36 аудыторыі біякорпуса сабраліся тыя, хто вывучае нямецкую мову.

Па-рознаму падыходзяць студэнты да стала, дзе раскладзены білеты. Вось хвалюецца, працягваючы руку за «лёсам», Нікалай Гесь. А чорнабровая рухавая дзяучына, якая зашла за ім, бярэ білет спакойна і упэунена: Аліна Свірская добра працавала на працягу усяго года, ніякае пытанне не спалохае яе, не з'явіцца нечаканым. Але калі яна села адказваць, і яе ахапіла звычайнае хваляванне, хоць усё было падрыхтавана. Першае пытанне: чытанне і пераклад тэкста па спецыяльнасці. Алі давялося чытаць пра спарынню. Яна вельмі добра пераклала тэкст з многімі батанічнымі тэрмінамі, без асаблівых цяжкасцей разабрала сказ. Ведала яна і інфінітыуныя звароты, пра якія запыталася выкладчыца Л. К. Хурсік. І калі Аліне Свірскай параунаўча лёгка «далася» выдатная адзнака, то Нікалаю Гесю давялося папацець, каб у заліковай кніжцы з'явілася «добра».

— Гультай ён вялікі,—кажа Лідзія Карпауна,—можа добра вучыцца, а прапускау заняткі, прыходзіу на лекцыі непадрыхтаваным.

І сапрауды, калі глянуць на яго кантрольную работу, то цяжка устанавіць, чаго больш на паперы: слядоу чырвонага алоука выкладчыка ці напісаных Гесем радкоу. Нямала давялося Нікалаю папрацаваць перад экзаменамі, каб завяваць «добра». Не раз, бачна, памяняу ён нядобрым словам і пропускі свае, і лёгкадумства.

— Вынікамі агульнымі я задаволена,—гаворыць Лідзія Карпауна.—Група гэта нялёгкая. У ёй сабраны студэнты, якія дрэнна ведалі нямецкую мову. А цяпер яны могуць даволі удала перакладаць спецыяльныя тэксты.

Праглядаючы ведамасць, дзе стаяць радам з добрымі і выдатнымі адзнакамі і дзве пасрэдныя (у Дашкоускай і Клімковіч), выкладчыца адзначае:

— Свірская і Высокауская і ў годзе займалися старанна, ад іх выдатных адказау я чакала. Парадавалі Жолудзева, Шчэрбакова, якія атрымалі «выдатна». Бачна, што яны папрацавалі нямала перад тым, як прыйсці на экзамен. Асабліва я задаволена Сасноускай і Гембіцкім. Зусім дрэнна ведаючы мову у мінулым годзе, яны за апошні час набылі добрыя веды. Іх стараннасць прынесла поспех: адказы былі упэуненымі і заваявалі ацэнку «добра». Добра адказвала і Драздоуская, якая пераведзена у гэтым годзе з завочнага факультэта. Але зусім іншы «сюрпрыз» прыпаднесла Дашкоуская, якой я вымушана была паставіць «пасрэдна». Некалі яна нават выдзялялася сярод іншых. І вось зазналася, не лічыла патрэбным працаваць, адсюль—і вынікі няважныя.

На калідоры-ж поуным ходам ішло абмеркаванне экзамена. Некаторыя узнагароджвалі Л. К. Хурсік эпітэтам «строгая», але ніхто не скардзіуся. Гесь і Парчэускі ужо марылі, як пасля экзаменаў яны паедуць на практыку у Белавеж, як там будзе цудоуна.

— Там мы адпачнем, тэорыю замацуем практыкай. А пакуль што трэба зноу садзіцца за работу. Зроблен толькі пачатак, хай і нядрэнны. Напярадзе яшчэ другія нялёгкія экзамены.

Дык ні пуху, ні пяра, сябры!

Г. БУРАЎКІН.

НА ПАСЯДЖЭННІ ПАРТЫЙНАГА КАМІТЭТА

Днямі партыйны камітэт БДУ абмеркаваў пытанне аб будаўніцтве жылога дома.

Заслухаушы інфармацыі члена парткома тав. Кірсанава і прарэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце тав. Бярэзіна, партком адзначыу, што будаўніцтва жылога дома вядзецца марудна. Маецца рад недахопау у якасці выкананых работ, часта зрываецца ход будаўніцтва з-за адсутнасці будаунічых матэрыялау.

Партыйны камітэт пастанавіў наладзіць строгі кантроль за ходам будаўніцтва. Адказным за гэта выдзелены член парткома тав. Кірсанау.

Партком указаў прарэктару па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце на неабходнасць удзяляць больш увагі будаўніцтву.

Разам з тым партыйны камітэт рашыу звярнуцца у партыйную арганізацыю СМУ-6, каб камуністы будаупраўлення абмеркавалі на сваім сходзе вынікі работ па будаўніцтву жылога дома для БДУ.

Было прапанавана таксама выдзеліць ад мясцкома грамадскі кантроль за ходам будаўніцтва.

ПАРТЫЙНЫ СХОД НА ФІЛФАКУ

17 мая адбыуся партыйны сход на філалагічным факультэце. З дакладам аб падрыхтоуцы і правядзенні летняй экзаменацыйнай сесіі выступіў дэкан факультэта М. Г. Ларчанка. Сход намеціў канкрэтныя мерапрыемствы, накіраваныя на паспяховае правядзенне сесіі.

Н. ПЯТРОЎСКІ.

Вечары ва універсітэце

Днямі ў клубе універсітэта адбыуся вечар, прысвечаны Дню друку. З дакладам «Дзень партыйнага совецкага друку» выступіў загадчык аддзела інфармацыі газеты «Советская Белоруссия» тав. Марозаў.

Аб выніках конкурса на лепшую насценную газету паведаміў студэнт III курса аддз. журналістыкі М. Пільшчыкаў. Першае месца на конкурсе сярод факультэцкіх газет заняла газета філалагічнага факультэта «Слова філолага», дзе адказны рэдактар кандыдат філалагічных навук В. А. Захарава. Рэдкалегія гэтай насцengазеты узнагароджана грашовай прэміяй і граматай рэктарата. Грашовыя прэміі і граматы рэктарата таксама атрымалі рэдкалегіі насцengазет юрыдычнага і геолага-геаграфічнага факультэтау.

Студэнты—актыуныя супрацоунікі насцengазет—былі узнагароджаны каштоунымі падарункамі.

У заключэнне вечара перад удзельнікамі выступіў з канцэртам мастацкай самадзейнасці драматычны калектыў фізмата.

Б. ЧОРНЫ.

* * *

Добра адзначылі Дзень перамогі ва універсітэце. У клубе адбыуся урачысты вечар, на якім генерал-маёр тав. Кірсанау прачытаў даклад аб самаадданай барацьбе совецкага народа супраць нямецкіх захопнікаў. Ён расказаў некалькі эпізодаў са свайго франтавога жыцця.

Пасля былі паказаны дакументальныя кінофільмы.

Пісьмы ў рэдакцыю

Ці так павінна быць?

Да паслуг студэнтаў—кабінеты і лабараторыі, укамплектаваныя літаратурай і вучэбнымі дапаможнікамі.

У прыватнасці, кабінет марксізма-ленінізма мае вялікую колькасць кніг. Тут дзесяткі экземпляраў твораў Маркса, Энгельса, Леніна. Пры падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў студэнты могуць атрымаць неабходную кансультацыю. Здавалася-б, што адносіны да кніг павінны быць беражлівымі.

Нажаль, рад студэнтаў дрэнна адносіцца да дзяржаўнай маёмасці. З многіх кніг вырваны старонкі, маюцца розныя подпісы і г. д. Мала гэтага. Многія зусім не вяртаюць кніг. Вось студэнтка-выпускніца аддзялення журналістыкі Ольга Пілецкая. Ужо два гады, як яна не вяртае у кабінет часопіс «Новое время» № 21 і 22. Студэнтка хімічнага факультэта Людміла Берасневіч доўгі час не здае кнігу «Марксісцкі дыялектычны метад». Студэнтка біёлага-глебавага факультэта Валянціна Яусеева не здае другі том «Капітала» Маркса. Тамара Дзяшкевіч выключана з універсітэта. Яна звезла з сабой чатыры кнігі, а узамен пакінула свой пашпарт.

Асабліва хочацца сказаць аб студэнце 4 курса аддзялення журналістыкі Анатолю Мядведзеву. У яго на руках пяць кніг. Яму некалькі разоў напаміналі аб тым, што кнігі неабходна здаць. Ён увесь час абяцаў, але кніг так і не здаў. Цяпер Мядзведзеву пераведзены на завочны факультэт. Узнікае пытанне: як магла навучальная частка перавесці студэнта на завочны факультэт, калі ён не разлічыуся з кабінетам?

Наогул трэба сказаць, што навучальная частка і дэканаты не займаюцца гэтым пытаннем. А трэба было-б заняцца.

І. ГАРБАЛЕНЯ,
заг. кабінета асноў марксізма-ленінізма.

ЧАМУ?

Празвінеў званок. Па усіх калідорах стаяць групы студэнтаў і горача абмяркоўваюць свежы нумар «Беларускага універсітэта».

Любяць студэнты сваю шматтыражную газету. Радуюцца яе поспехам і перажываюць няудачы. Дзесяткі студэнтаў з'яўляюцца аутарамі заметак, якія змяшчаюцца у газеце.

Але нельга гэтага сказаць аб многіх прафесарах, выкладчыках. Рэгулярна выпісвае газету толькі прафесарска-выкладчыцкі склад філалагічнага і хімічнага факультэтаў. На астатніх-жа факультэтах падпіскай на газету «Беларускі універсітэт» ахоплены толькі асобныя таварышы. Напрыклад, на гістарычным факультэце падпісаўся толькі адзін дацэнт Г. М. Ліушыц.

Як-жа звязаны з жыццём універсітэта нашы паважаныя педагогі і выхавацелі? Відавочна, вельмі слаба. А газета дапамагла-б ім пауней даведацца аб запатрабаваннях шматлікага студэнцкага калектыву.

Грамадскасць універсітэта чакае адказу: чаму не выпісваюць шматтыражную газету многія выкладчыкі?

Л. ФРЭНКЕЛЬ,
член прафкома БДУ.

ВЁСНЫ ГРЫГОРЬЯ СТАНКЕВІЧА

З матэрыялаў, паступіўшых на конкурс

(НАРЫС)

На дзвярах аудыторыі надпіс: «Залік па хіміі здаюць студэнты І курса фізмата». Звычайны залік! Здаецца, нічога страшнага няма. Але студэнты хвалююцца, і кожны з іх стараецца прыпомніць вось тут, ля дзвярэй, ці усё прагледзеу, ці не упусціу ён чаго-небудзь важнага... А хто-кольвек з нецярплівасцю раз-по-раз заглядвае у шчылінку, прыслухоуваецца.

— Ну, як там Грыгорый, трымаецца?—Фелікс Дрэйцар запытальна паглядвае на Кірыла Грыецца ля дзвярэй.

Аднакурснікі міжвольна усміхаюцца: яны добра ведаюць, чаго так непакояцца Фелікс і Кірыл. Грыгорый Станкевіч—іх лепшы сябра. Утраіх яны заужды рыхтаваліся да лекцый, разам перачытвалі увесь матэрыял напярэдадні залікаў. А цяпер вось, як кажуць аднакурснікі, і «хварэюць» адзін за аднаго.

Неузабаве дзверы расчыняюцца, і у калідор выходзіць Грыгорый, трымаючы заліковую кніжку. Па яго твары бачна, што ён задаволены. Значыць, ёсць залік!

— Парадачак!—удакладняе Кірыл.

Віншаванні, поціскі рук—і вось ужо яны утраіх накіроуваюцца да выхаду.

— Хлопцы, пасядзім у скверыку!—гаворыць Грыгорый, і сябры моучкі згаджаюцца з ім: добра пасядзець, пагутарыць, памарыць у такі час, калі навокал—вясна, з першай зелянінай трау, з блакітам нябёс і сонечным цяплом.

Гэтая вясна ва універсітэце у Грыгорыя першая. Летась ён здзейсніу сваю мару—паступіу на фізмат. Вучоба падабалася, захапляла і радавала. Для Грыгорыя тут знайшлося шмат цікавых спраў: ён адразу запісаўся і у танцавальны гурток і стаў наведваць валейбольную секцыю. І разам з гэтым настойліва працаваў. Не адзін—з сябрамі. Калі што было незразумелым—на дапамогу прыходзілі і Фелікс, і Кірыл. Зімнюю экзаменацыйную сесію Грыгорый вытрымаў паспяхова: усе экзамены здаў на добра і выдатна.

А пасля канікул работы пабольшала. З прыходам вясны трэба было больш чытаць, рыхтавацца да практычных і семінарскіх заняткаў. І вось цяпер ён здаў першы залік летняй сесіі, зрабіу усе чарцяжы для залікаў па машынабудаванню і чарчэнню, рыхтуецца да экзаменаў.

Першая універсітэцкая вясна сустрэта Грыгорыем настойлівай, упартай працай. Першая... А усяго іх у жыцці было нямала—дваццаць шэсць. І неяк хочацца вось цяпер, у прыгожы сонечны дзень, седзячы побач з сябрамі, кінуць погляд назад, на свае адшумеушыя вёсны.

...Гэта быу год Перамогі—слаўны сорак пяты. Совецкая Армія граміла ворага і, нястрымна развіваючы наступленне, усё шчыльней брала у стальное кальцо фашысцкае логава—Берлін. У адной з часцей, што набліжаліся да Берліна, быў гвардыі радавы Грыгорый Станкевіч. Тады таксама стаяла вясна, хоць зляніна траву была пакрыта густым пылам ад прайшоушых танкаў, бронемашын, самаходак. Дарогі вайны пахлі гарам і дымам.

Баі на подступах да Берліна былі асабліва крывепралітнымі. У адным з іх Грыгорыя цяжка параніла асколкам снарада.

Ён быу дастаулены у шпіталь. Нялёгка было шаснаццацігадоваму юнаку. І можа, каб не гарачая падтрымка сяброу па шпіталю, наурад ці вытрымау-бы ён. Асабліва запамятауся Грыгорыю адзін артылерыст, увесь перавязаны бінтамі.

— Нічога, сынок, не паддавайся!—падбадзёрваu ён часта юнака.—Мы-ж салдаты з табою.

І Грыгорый не паддаваuся. Трымаuся. Жыу. А салдат-артылерыст неузабаве памёр ад ран.

Калі Грыгорый выпісаuся са шпіталю, вайна ужо закончылася. Але армію ён не пакінуу, і праслужыу у ёй да 1951 года. Цяпер перад ім паўстала пытанне: «Куды пайсці?» З гэтым ён асабліва не марудзіу—рашыу падацца на мінскі завод, дзе распачау працу вучнем гравёра.

У жыццё увайшло новае—праца, сустрэчы і знаёмствы з маладымі рабочымі. Грыгорый не доуга прыглядаuся да заводскіх будняў, ён хутка зжыuся з працавітай сям'ей.

Грыгорый даўно думаў аб тым, каб прадоўжыць сваю вучобу. Да вайны ён закончыу усяго сем класаў. Але гэтага вельмі мала. А тут амаль кожны па вечарах сядзіць за кнігамі.

І таму, калі Пётр Зубковіч, з якім ён працаваu на адным станку, прапанаваu яму пачаць вучыцца у вячэрняй школе, Грыгорый з ахвотай згадзіuся. Ён пачаu займацца у восьмым класе. Ішлі дні. І было бачна, што і працаваць і вучыцца не так лёгка. Асабліва цяжка давалася матэматыка. Грыгорый спрабаваў шмат часу праседзваць над алгебраічнымі формуламі, але поспеху дасягнуць не мог. Дапамагалі сябры, але у Грыгорыя усёроuна было многа нявысветленага. Веды былі далёка не багатымі. Часамі Грыгорыю пачынала здавацца, што ён нездольны да вучобы. І неяк вясной ён, нікому не сказаушы, рашыу зусім не наведваць школу.

Адсутнасць Грыгорыя на уроках першай зауважыла аднакласніца і таварыш па рабоце Тамара Смірнова. Яна сказала Пятру Зубковічу:

— Так ён можа зусім закінуць заняткі. Па матэматыцы трэба дапамагчы Грыгорыю. І слухай, Пятро, ты, як яго лепшы сябра, пагаварыў з ім наконт школы. Ну, ведаеш як—сур'ёзна, па-мужчынску.

Пятро уважліва паглядзеу на Тамару, нічога не сказаu, толькі сцвярджальна кіунуу галавой у знак згоды.

У той-жа вечар Пятро і Грыгорый доуга сядзелі адны у пакоі, гутарылі. Пра школу амаль ні слова, а болей пра жыццё, пра будучае. І зразумеу Грыгорый, што глупства ён зрабіу, што не можа ён быць так, без вучобы. Нават злосна на самога сябе стала: на фронце не раз у атаку хадзіу, а тут адступіу, змаладушнічаu... І успомнілися яму словы, што гаварыу некалі у шпіталі артылерыст: «Мы-ж салдаты з табою...»

Грыгорый вярнууся у школу. За матэматыку узяuся па-сапраўднаму. Кожны дзень сядзеу над падручнікамі па алгебры і геаметрыі. Другі раз нават на рабоце міжвольна прыходзілі у галаву знаёмыя формулы і тэарэмы.

Тою вясной ён вытрымау экзамен па матэматыцы. А летам распрацаваu для сябе план і зноу паутарыu увесь пройдзены курс па матэматыцы. У выніку тое, што здавалася раней цяжкім, было цяпер надзвычай зразумелым.

Непрыкметна прайшлі гады вучобы у дзевятым і дзесятым класах. Настойлівасць і упартасць Грыгорыя перамаглі—па матэматыцы ён заусёды атрымліваu добрыя адзнакі. А школу у прошлым годзе закончыу са срэбраным медалем.

І у працы гравёр Грыгорый Станкевіч быу упарадзе—норму выпрацоукі ён выконваu на 200 працэнтаў і больш. Яшчэ тады, калі ён рашыу ліквідаваць недахоп ведаu па матэматыцы, Грыгорый паставіу і другую мэту—паступіць абавязкова на фізіка-матэматычны факультэт. Летам ён ажыццявіу яе.

Грыгорый быу залічаны на фізмат.

Добры дзень, універсітэт!

...Грыгорый і не заuважыу, што ён вось ужо некалькі мінут сядзіць задумаушыся, аддаушыся успамінам.

Побач Фелікс і Кірыл аб нечым спрачаюцца, гавораць аб тым галоуным, што чакае упарадзе,—аб экзаменах.

— Ды хопіць, хлопцы, аб экзаменах,—гаворыць Грыгорый,—здадзім абавязкова!

— Вядома, здадзім!—згаджаюцца сябры.—Але усё-ж...

— Усё-ж трэба пайсці нам сёння у кіно,—у другі бок паварочвае гутарку Грыгорый.

Студэнты дружна падымаюцца з лаукі і ідуць сцяжынкай па універсітэцкаму скверыку.

Цёпла. Скверык тоне ў моры асляпляючых сонечных промняў. Насустрач промням уверх, у блакіт, цягнуцца дрэуцы сваімі зялёнымі лісточкамі-далонямі.

Эд. КАРПАЧОУ,
В. ПАЎЛОВІЧ.

ЗАДАЧЫ КАФЕДРЫ ПАЛІТЭКАНОМІІ ў святле рашэнняў XX з'езда КПСС

XX з'езд КПСС падкрэсліў велізарнае значэнне ідэалагічнай работы нашай партыі, творчага развіцця марксісцка-ленінскай тэорыі ў непарыунай яе сувязі з практыкай. І гэта зразумела, таму што роля і значэнне марксісцка-ленінскай тэорыі ў перыяд паступозага пераходу ад соцыялізма да комунізма усё больш узрастае.

В. І. Ленін вучыць, што у розныя перыяды на першы план выступае то адзін, то другі бок марксізма. На цяперашнім этапе, ва умовах барацьбы нашага народа за высокую прадукцыйнасць працы, за вырашэнне асноунай эканамічнай задачы СССР, на першы план выстауляецца эканамічны бок марксізма-ленінізма, пытанні канкрэтнай эканомікі. З гэтага вынікае, што ў сучасны момант асабліве значэнне набывае эканамічная адукацыя нашых кадраў з тым, каб яны займаліся гаспадаркай, з веданнем справы, умелі знаходзіць унутраныя рэзервы вытворчасці, максімальна выкарыстоўваць дасягненні навукі, тэхнікі і перадавога вопыту.

На XX з'ездзе КПСС адзначана адставанне грамадскіх навук, у тым ліку і эканамічнай навукі, ад задач комуністычнага будаўніцтва. Трэба сказаць, што моцным тормазам у творчым развіцці рэволюцыйнай тэорыі быу культ асобы, які знішчаu веру у свае сілы, у здольнасць рушыць уперад марксісцка-ленінскую тэорыю ў работнікаў ідэалагічнага фронту.

Перад работнікамі ідэалагічнага фронта стаяць вялікія і адказныя задачы: яны павінны ліквідаваць адставанне навуковай работы ад задач, якія выстауляюцца жыццём, практыкай комуністычнага будаўніцтва.

У паспяховым ажыццяўленні велічнай праграмы комуністычнага будаўніцтва, прынятай XX з'ездам КПСС, важнае месца належыць совецкай вышэйшай школе. Яна заклікана рыхтаваць кваліфікаваных спецыялістаў, выхаваных у духу марксізма-ленінізма, актыўных будаўнікоў комуністычнага грамадства.

Марксісцка- ленінскае выхаванне будучых спецыялістаў—справа усяго прафесарска-выкладчыцкага складу вышэйшых навучальных устаноу. Але асаблівая роля у гэтым належыць кафедрам грамадскіх навук і іх выкладчыкам.

Выкладанне грамадскіх дысцыплін, якое абапіраецца на практыку комуністычнага будаўніцтва, у значнай меры вызначае палітычны узровень будучага спецыяліста. Іменна таму не можа быць цярпімым адрыў выкладання марксісцка-ленінскай тэорыі ад жыцця, ад практыкі комуністычнага будаўніцтва, дагматызм і начотніцтва, якія усё яшчэ маюць месца ў выкладанні грамадскіх навук.

Зыходзячы з рашэнняу XX з'езду партыі, кафедра палітэканоміі, прааналізаваўшы сваю работу у мінулым, намеціла мерапрыемствы на будучае. Кафедрай надавалася і надаецца многа увагі павышэнню якасці выкладання марксісцка-ленінскай эканамічнай тэорыі. З гэтай мэтай ажыццяуляуся і ажыццяўляецца кантроль за лекцыйнай работай выкладчыкаў і правядзеннем семінарскіх заняткаў, шырока практыкуецца узаемнае наведванне выкладчыкамі лекцый і семінарскіх заняткаў з наступным іх абмеркаванням на пасяджэннях кафедры, а таксама папярэдняе абмеркаванне тэкстаў лекцый. Толькі за першае поугоддзе гэтага навучальнага года было абмеркавана пяць лекцый на розныя тэмы. Гэта садзейнічала павышэнню іх ідэйна-тэарэтычнага узроуню.

У мэтах павышэння педагагічнага майстэрства выкладчыкаў кафедрай удзяляецца значная увага метадычным пытанням. На кафедры былі абмеркаваны даклады аб методыцы чытання лекцый і правядзення семінарскіх заняткаў, а таксама аб самастойнай рабоце студэнтаў. Даклады гэтыя выклікалі вялікую цікавасць з боку выкладчыкаў і жывы абмен думкамі, што, несумненна, садзейнічала паляпшэнню выкладання.

Аднак у рабоце калектыву кафедры маюцца некаторыя недахопы.

Так, выкладчык М. А. Чаплінская пры правядзенні семінарскіх заняткаў на 4-м курсе гістарычнага факультэта па тэме «Грамадская праца пры соцыялізме» няправільна размеркавала час для асвятлення пытанняу тэмы, у выніку чаго такое важнае пытанне тэмы, як «Няўхільны рост прадукцыйнасці працы—эканамічны закон соцыялізма», было не асветлена. На семінарскіх занятках студэнты задалі рад пытанняу, на якія М. А. Чаплінская не змагла даць адказу. Гэта—рэзультат дрэннай падрыхтоўкі выкладчыка да заняткаў.

Практыка работы вышэйшай школы паказвае, што паспяховае правядзенне вучэбнага працэсу, павышэнне ідэйна-тэарэтычнага узроуню выкладання грамадскіх навук немагчыма без сістэматычна праводзімай выкладчыкамі навукова-даследчай работы.

Навукова-даследчая работа кафедры у 1955 г. выражалася у напісанні дысертацый, брашур. Члены кафедры В. А. Тамашэвіч і П. У. Грышановіч працавалі над сваімі доктарскімі, а І. Т. Рагоускі і М. А. Чаплінская—над кандыдацкімі дысертацыямі. П. У. Грышановіч, апрача работы над сваёй дысертацыяй, напісаu і апублікаваu работу ў аб'ёме 7,5 друкаваных лістоу «Аб этапах агульнага крызісу капіталізма». Выкладчыкі Ф. В. Баравік і С. Е. Янчанка падрыхтавалі работы для апублікавання ў «Вучоных запісках універсітэта». Акрамя таго, членамі кафедры апублікаван у

ПАРТЫЙНАЕ ДАРУЧЕННЕ — метад выхавання комуністаў

Партыйная арганізацыя хімічнага факультэта налічвае 27 чалавек.

Кожны комуніст, апрача аспірантаў трэцяга года навучання, нясе адказнасць за той участак работы, які за ім замацаваны. У цэнтры ўвагі стаіць палітыка-выхаваўчая работа сярод студэнтаў. Асобае значэнне надаецца рабоце у вучэбных групах, за якімі замацаваны комуністы. Сумесна з комсамольскім бюро, бюро групы яны планіруюць і праводзяць сваю работу.

Большасць комуністаў выконвае свае абавязкі добрасумленна. Сярод іх Л. І. Валаховіч, В. Г. Шлык, В. Ф. Беляеў, О. Р. Скараход. З асаблівай цеплынёй і удзячнасцю гавораць студэнты аб рабоце О. Р. Скараход, В. Ф. Беляева, аб іх чулых адносінах да студэнтаў. Яны рэгулярна праводзяць у групах палітінфармацыі, гутаркі, дапамагаюць у правядзенні масавых вечароў, арганізуюць экскурсіі на заводы, фабрыкі, цікавяцца жыццём, бытам студэнтаў. Іх можна бачыць не толькі у аудыторыях, лабараторыях, а і у інтэрнаце.

Члены партыйнага бюро асноўную ўвагу звяртаюць на забеспячэнне сістэматычнай і зладжанай работы комуністаў, прафоргау і старост груп. На пасяджэннях бюро заслухоўваліся справаздачы сакратароў комсамольскіх арганізацый I—IV курсаў.

Вялікая ўвага удзяляецца партыйнай арганізацыяй і навукова-даследчай рабоце. У сувязі з Дырэктывамі па шостаму пяцігадоваму плану унесены канкрэтныя змены у план навукова-даследчай работы.

Нажаль, не усе яшчэ комуністы працуюць с сапраўдным партыйным аганьком, запалам. Адказная за культурна-масавы сектар Т. А. Бальшова мала ўдзяляе ўвагі культурнаму адпачынку студэнтаў, вечары праводзяцца рэдка, на іх часта сумна.

Партыйная арганізацыя яшчэ мала звяртае ўвагі на тое, што не усе комуністы добрасумленна выконваюць свае абавязкі. Належала-б падняць на вышэйшы узровень і палітыка-выхаваўчую работу, бо часам маюць месца сярод студэнтаў амаральныя учынкі, не зусім добра з дысцыплінай на курсах.

Спадзяемся, што партыйная арганізацыя, улічваючы задачы, пастаўленыя XX з'ездам КПСС, прыкладзе ўсе намаганні, каб падняць партыйную работу на яшчэ вышэйшы узровень.

В. ІВАНОЎ.

Універсітэцкі ВОЖЫК



У апошні час

Н. Байдак, студэнтка III курса біялагічнага факультэта, не здала залік па замежнай мове і не выканала курсавую работу.

Н. Курцэр, студэнтка II курса біялагічнага факультэта, не здала залік па «Уводзінах у біялогію» яшчэ за першы курс.

Васільева, студэнтка IV курса аддз. глебазнаўства, на экзамене па дыялектычнаму матэрыялізму атрымала «пасрэдна».

Г. Чумакоў і А. Сенкевіч, студэнты II курса юрыдычнага факультэта, экзамен па марксізму-ленінізму здалі на «пасрэдна».

КАНФУЗ

І. Пушчын, сакратар комсамольскага бюро III курса геафака, прынёс на экзамен кіпу шпаргалак, ды яны.. падвялі хлопца: узялі і «разляцеліся» па аудыторыі.

Чтоб всё
получилось
без шума
и ловко,
Проведена
дома
спецподготовка.
Но результаты
поистине
жалки—
У всех
на виду
разлетелись
шпаргалки.

Фельетон

НЕЗВЫЧАЙНАЕ ЗДАРЭННЕ

28 красавіка 1956 года грамадзяне Мінска, праходзячы вечарам па вуліцы Кірава, назіралі рэдкую з'яву: на ганку гасцініцы «Беларусь» валтузілася нейкая дзіуная істота, якая знешне нечым нагадвала чалавека. Задраушы галаву да зорак, яна працягла скуголіла. Трывожныя гукі былі падобны на выццё фабрычнай сірэны і несліся у далечыню, прымушаючы людзей забыць самыя неадкладныя справы і далучыцца да натоупу.

— Пазваніце ў цырк!—раздаваліся галасы,—мабыць, збегла нейкая дрэсіраваная жывёла.

— Што вы,—пярэчылі іншыя,—жывёліна яуна дзікая. Званіць патрэбна у звярынец.

— Ва універсітэт,—прапішчэлі з натоупу студэнткі, якія, нягледзячы на тое, што некуды спяшаліся, усё-ж падышлі паглядзець на здарэнне.—Гэта не жывёліна, гэта-ж Алег Сініцкі. Ён проста п'яны і зараз мудрагеліць.

Так! Яны аказаліся правы. Гэта быу сам Алег Сініцкі, вядомы чытачам газеты «Беларускі універсітэт» як непрызнаны вынаходца новага спосабу уборкі бульбы, пры каторым кожны гультай мог поуз насцю замяніць бульбакапалку. Чалавецтва насмяялася над ім, змясціушы карыкатуру ва «Універсітэцкім вожыку», і у Алега Сініцкага безумоуна былі усе падставы, каб з таго часу пяць і выць на месяц. Калі-ж да усяго сказанага дабавіць па сакрэту, што яму не шанцавала у асабістым жыцці і ён быу апанаваны рэунасцю і падазрэннямі, то толькі бессардэчныя могуць не паспачуваць небараку.

— Ты, бессорамная,—леманцавау Сініцкі, — на каго прамяняла мяне, маладога і цікавага,—на нейкага дзеда... Ну, не інакш, як на гэтага вось дзеда, што стаіць насупраць і насмешліва пазірае на мае пакуты. Але не дам яму трыумфаваць! — вочы Сініцкага заіскрыліся гневам.

Тут усе зауважылі у руках «пакутніка» жалезную балванку. Натоуп ахнуу і падауся назад. А п'яніца наляцеу на старога з крыкам: «Аддай, мярзотнік, маё сэрца, якое ты у мяне украу!»

«Сэрца-ж» яго, аказваецца, у вобразе асобы жаночага полу, знаходзілася побач. Яно скакала наукол Алега, цягнула за фалды пінжака і умаляла супакоіцца.

Не ведаем, што было-б з дзедам, калі-б міліцыянеры не звязалі хулігана і не павялі у аддзяленне.

Да самага участка міліцыі «сэрца» ішло за імі і мармытала: «Дайце, я сама адцягну яго на кватэру».

Неабходна адзначыць, што падзеі 28 красавіка, героем якіх быу А. Сініцкі, набылі шырокую агалоску, бо гарадская сатырычная комсамольская газета на відным месцы (як гаворыцца у газетных аглядах) змясціла аб іх справаздачу і адпаведную ілюстрацыю.

Мяркуем, што адміністрацыя універсітэта не пакіне такі выпадак без увагі.

А. АЛЯКСАНДРАЎ.

ПЕРШАЯ ВЫТВОРЧАЯ ГЕОЛАГАРАЗВЕДАЧНАЯ ПРАКТЫКА

Закончылся заняткі на III курсе геалагічнага аддзялення. Хутка студэнты раз'едуцца у розныя раёны нашай краіны для праходжання першай вытворчай практыкі.

Якая-ж мэта практыкі? Без перабольшання можна сказаць, што гэта—найбольш важны этап у навучанні студэнтаў геолагаў-разведчыкаў, паколькі іменна ён служыць пачаткам іх будучай вытворчай дзейнасці. За 10-тыднёвую работу у геолга-разведачных партыях студэнты набываюць першыя навыкі па правядзенню буравых і горных выпрацовак, вывучаюць арганізацыю вытворчасці, перадавыя метады працы і рацыянальнае выкарыстанне механізмаў, набываюць навыкі вядзення тэхнічнай і геалагічнай дакументацыі і складання справаздач па геолагаразведачных работах.

Зусім відавочна, што увесь гэты складаны комплекс работ можа быць асвоены толькі пры непасрэдным удзеле студэнтаў у вытворчым працэсе, на рабочых месцах у якасці старшых рабочых, дзесятнікаў, калектараў, зменных майстроў і прарабаў.

Трэба падкрэсліць, што у мінулым годзе не ўсе студэнты правільна зразумелі свае задачы у вытворчай практыцы, многія з іх нават не пазнаёміліся з тэхнічнымі сродкамі, што выкарыстоуваліся пры разведцы, не вывучылі вытворча-тэхнічныя і эканамічныя паказчыкі работ у партыі і не выканалі асноуныя палажэнні праграмы практыкі.

У бягучым годзе патрабаванні да праходжання вытворчай практыкі значна павышаны. Паводле загаду Міністэрства вышэйшай асветы ад 9 сакавіка 1956 г., залікі па вытворчай практыцы будуць ацэньвацца чатырохбальнай сістэмай і па свайму значэнню прыроунены да экзаменаў па тэарэтычных курсах.

Кіраўніцтва практыкай студэнтаў, побач з кіраўнікамі геолага-разведачных партый, будзе ажыццяўляцца і выкладчыкамі універсітэта.

Пры выездзе на месца практыкі студэнты, акрамя праграмы, атрымаюць індывідуальныя заданні і узоры дзённіка, які яны абавязаны старанна весці і затым выкарыстаць яго як аснову для складання сваёй справаздачы.

Вытворчая практыка дазваляе студэнту не толькі замацаваць свае тэарэтычныя веды і набыць першыя практычныя навыкі, але і прадстауляе шырокія магчымасці для навуковай дзейнасці. Таму перад выездам на практыку студэнты павінны са сваімі выкладчыкамі намеціць тэмы для сваёй будучай работы у студэнцкіх навуковых гуртках.

Матэрыялы першай вытворчай практыкі кладуцца у аснову і курсавога праекта, які складаецца на IV курсе. Такім чынам, значэнне гэтай практыкі цяжка пераацаніць.

Студэнты III курса геалогіі павінны добра зразумець задачы першай вытворчай практыкі, прыкласці максімум намаганняу для выканання яе праграмы, скласці поунацэнную справаздачу і абараніць яе на пасяджэнні кафедры не ніжэй як на добра.

Д. КАРУЛІН,
в. а. заг. кафедры вышукальна-разведачнай справы.

рэспубліканскім друку рад артыкулау на эканамічныя тэмы.

Неабходна адзначыць, што у навукова-даследчай рабоце, якая вялася на кафедры, меу месца адрыу навуковых дасягненняу ад жыцця, ад работы прадпрыемстваў, калгасаў, МТС і соугасаў рэспублікі. Выкладчыкі у сваіх даследаваннях слаба займаліся абагульненнем і распаусюджваннем перадавога вопыту у галіне народнай гаспадаркі. Акрамя таго, у навукова-даследчай рабоце мелі месца раздробленасць і выпадковасць тэматыкі навуковых работ.

Абмеркаваушы пытанне аб стане і задачах навукова-даследчай работы у святле рашэнняу XX з'езду КПСС, кафедра рашыла сканцэнтраваць намаганні сваіх выкладчыкау на распрацоуцы такой тэмы, як «Шляхі павышэння прадукцыйнасці працы у калгасах (на матэрыялах калгасау БССР)». Гэтая работа разлічана на два—тры гады. Для распрацоукі гэтай надзвычай важнай для народнай гаспадаркі тэмы, якая скаардынавана з Інстытутам эканомікі Беларускай Акадэміі навук, акрамя членау кафедры, будуць таксама прыцягнуты работнікі МТС і калгасау. Гэта, безумоуна, будзе садзейнічаць творчаму росту работнікау кафедры, умацаванню сувязі навукова-даследчай работы з вытворчасцю.

Істотнае значэнне у павышэнні кваліфікацыі выкладчыкау мае падрыхтоука і абмеркаванне навуковых дакладау. Членамі кафедры быу прачытан рад такіх дакладау на пасяджэннях кафедры і навуковых сесіях універсітэта. Неабходна часцей практыкаваць абмеркаванне дакладау па пытаннях марксісцка-ленінскай тэорыі, сістэматычна абмяркоуваць навуковыя работы, якія выходзяць у свет. Акрамя таго, трэба праводзіць творчыя дыскусіі па актуальных пытаннях практыкі комуністычнага будауніцтва як асобна кафедрай, так і разам з іншымі кафедрамі універсітэта.

У справе павышэння кваліфікацыі выкладчыкау палітэканоміі, а таксама узмацнення іх сувязі з вытворчасцю вялікую ролю могуць адыграць спецыяльныя семінары з удзелам у іх практычных работнікау прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

У рабоце кафедры палітэканоміі нашага універсітэта віднае месца займае падрыхтоука маладых навуковых работнікау. Поспех падрыхтоукі навуковых работнікау праз аспірантуру залежыць, перш за усё, ад тэарэтычнай падрыхтаванасці і практычнага стажу работы асоб, якія прымаюцца у аспірантуру, а таксама ад пастаноукі справы па навуковаму кіраўніцтву і кантролю за іх работай у час знаходжання у аспірантуры. Трэба адзначыць, што аспіранты кафедры здавалі і здаюць кандыдацкія экзамены паспяхова. Тэмы, абраныя аспірантамі для напісання сваіх кандыдацкіх дысертацый, маюць важнае тэарэтычнае і народнагаспадарчае значэнне. Мы ставім мэтай дабіцца, каб аспіранты яшчэ у працэсе падрыхтоукі сваіх дысертацый змаглі апублікаваць асобныя артыкулы на аснове даследаваных імі матэрыялаў.

Навукова-даследчая работа ва універсітэце не абмяжоуваецца толькі выкладчыкамі, у яе павінны уцягвацца таксама і студэнты. Асноуным недахопам у гэтай рабоце кафедры з'яуляецца тое, што вельмі мала уцягнута студэнтаў у навукова-даследчыя студэнцкія гурткі, што навукова-даследчая работа студэнтаў амаль не звязана з вытворчасцю.

Шырокі і складаны круг пытанняу, якія стаяць перад кафедрай палітэканоміі. Нам трэба яшчэ многае зрабіць, каб выкладчыцкая і навукова-даследчая работа кафедры стала на узровень патрабаванняу, якія выцякаюць з рашэнняу XX з'езду КПСС.

Т. БАЗЫЛЕЎ,
заг. кафедры палітэканоміі.

У нагу з жыццём

Сярод факультэцкіх навуковых бюлетэняу адным з лепшых з'яуляецца «Бюлетэнь СНО» біялагічнага факультэта (рэдактар тав. Паповіч). Газета адзначаецца паунатой асвятлення навуковай работы, своечасовай пастаноукай многіх пытанняу паусядзённага жыцця. У ёй узнімаюцца праблемы, якія маюць вялікае практычнае значэнне, напрыклад, аб дадатковым апыленні ячменю, падкормцы бульбы мікрадозамі купаросу. Змешчана цікавае паведамленне аб сканструяваным студэнтам Якушавым прыборы для выяўлення утрымання у глебе калія.

Навуковы бюлетэнь з нумара у нумар друкуе паведамленні аб абароне дысертацый, матэрыялы аб рабоце студэнцкіх навуковых гурткоу, выступае з артыкуламі аб дыпломных і курсавых работах, аб вытворчай практыцы студэнтау. Так, у чацвертым нумары рэдкалегія своечасова падняла пытанне аб падрыхтоуцы да студэнцкай навуковай канферэнцыі, да агляду студэнцкіх навуковых работ.

Т. КЛЯНОЎСКАЯ.

«БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ»
18 мая, 1956 года, 3 стар.

Літаратурная Старонка

студэнтаў I курса аддзялення журналістыкі

ПРАЛЕСКІ

Вясна уступала ў свае сілы,
Дождж першы дробна
церушыў.
— Нарві пралесак,—ты
прасіла,—
Каб абудзіць вясну у душы.

Я усе абходжваў пралескі,
Вымочваў ногі у расу
І нёс табе штодзень
пралескі—
Вясны нябесную красу.

Расой пялёсткі дзіўна ззялі,
Бы слёзы шчырыя у вачах.
Ты кветкі брала, мы маўчалі:
Шчаслівым добра й
памаўчаць.
Ды раптам кажаш ты
урачыста:
— Пралескі... радасць...
цуд лясны!

Хай наша дружба будзе
чыстай,
Як кветкі першыя вясны.

Аляксандр ШЧАСНОВІЧ.

МАТЕРИ

Мама, мама моя дорогая,
Мы расстались на зорьке с
тобой,
Ещё звёзды горели мигая,
Наземь сеяли свет голубой.

Ты со мной не спешила
проститься,
Хлопотала кругом без конца,
Словно та беспокойная птица,
Что в полёт отправляет
птенца.

За порог проводила ты сына,
Ещё раз обняла на ходу.
По щеке прокатилась слезина,
Словно капля росы по листу.

...От тебя я, родная, неблизко.
Пусть метелью пути занесло,
Но от чистой любви
материнской
Мне и тут бесконечно тепло.

Іван ПЕХЦЕРАЎ.

Рэактыўны

Празвінеу
На гулкім небасхіле,
Над зямлёй
Пранёсся, як страла.
У вышыні сваім магутным
Крыллем
Перарэзаў неба
Напалам.

І прамую
Срэбраную ленту
Працягнуў
Высока угару,—
Быццам ён
Для нашае планеты
У сусвет пракладвае
Маршрут.

Аляксандр АКУЛІК.

Стала ты другой

Поезд скоры, ну а мне
здаецца,
Што стаіць ён каля кожнага
слупа.
Каб ты ведала, як хочацца
сустрэцца
І пра усё адразу распытаць.
Аганьком, заместа
прывітання,
Мне мігнуу паустанак з
цемнаты;
Я чакаў шчаслівага
спаткання
Стрэчы, аб якой пісала ты.
А самой няма...
І толькі вечар
Вымушан адзін са мной ісці...
Можа ты, як пры ранейшых
стрэчах.
Знікла, каб знянацку
падыйсці?..
Не...
Сустрэу цябе я толькі ў залі
І у кругу дзявочым не пазнаў:
Бровы твае нітачкамі сталі,
І віхор у косах пагуляў.
Стала ты зусім другой,
Надзея,
Як паехала у інстытут з сяла,
І усё, за што любіў цябе я,
За капрызы моды аддала.
Болей я не бачыўся з табою—
Мусіць, нам не трэба быць
удвух.
Зноў у інстытут. Крануўся
мінскі поезд...
Агаёк за вокнамі патух.

Іван СІПАКОЎ.

В РАЗЛУКЕ

Опять письма нет... Уж
который день!
И ты бранишь осеннюю
погоду.
А лучше встань, армейский
плащ надень
И вспомни всё, пройдясь один
по городу:

Как и в разлуке жили вы
любя
И как она ждала до сорок
пятого;
Встречала, помнишь, юная,
тебя
Такой же чистою и
незапятнанной.

А нынче, видно, очень много
дел:
Придти с работы, досмотреть
детишек,
Чтоб клякс в тетрадях не
было нигде,
А перед сном прочесть им
пару книжек...

Ну, а письмо наверняка
придёт.
И в нём строка нехитрая
найдётся,
Что дочка—ей теперь всего
лишь год!—
Отца родного ждёт и не
наждётся...

Эдуард КАРПАЧОЎ.

Идём мы вдвоём

Идём мы вдвоём, а вокруг—ни души.
Снег скрипит под ногами, и светит луна,
Вдалеке чёрный лес, но и там тишина,
Простор снежный кругом—ни конца,
ни межи.

А дорога извилиста: горки, мосты...
Смехом звонким своим оглашаем мы
даль
Обращаюсь к тебе очень просто на «ты»
И хочу в этот вечер забыть про печаль.

Мы идем.

Скоро дом. Расставаться пора.
Я хочу рассказать тебе планы, мечты,
Я хотел бы продлить этот час до утра,
Но не знаю, на это согласна ли ты.

Пётр КАЗАЧОНАК.

Свіцязь

Як прыгожы свіцязянскія прасторы:
Аксамітная, баз краю шырыня;
Ніжа ночка ім каралі-зоры,
Што у карунках пеністых звіняць;

І спакойна у подыху іскрыстым
Хвалі шэпт паміж сабой вядуць;
Жоуты месяц лыжкай серабрыстай
Чэрпае са Свіцязі ваду;

І чаруе прыгажосць азёрная,
Думкай песень у душы плыве...—
Можа з гэтай кладзі срэбразорнае
Адліваў Міцкевіч звонкі верш.

Аляксандр АКУЛІК.

БІЛЕТЫ

(АПАВЯДАННЕ)

...Валя смяялася. Яе поуны, расчырванелы твар свяціуся лёгкай усмешкай. На твары, апрача радасці і весялосці, нельга было прачытаць больш нічога. Пасмачка валасоў, якая выбівалася з-пад белай пуховай шапачкі і спадала з нешырокага дзявочага ілба, надавала яму яшчэ большую прыгажосць.

Заспакоены тым, што на гэты раз запрашу яе у кіно, я пайшоу да кінотэатра.

У чарзе каля білетных кас давялося прастаяць больш двух гадзін: дэманстраваўся новы фільм, аб якім шмат пісалі газеты, і жадаючых паглядзець яго было многа. А вось, нарэшце, і білеты ў кішэні. Але не так лёгка іх аддаць таму, для каго яны узяты. Я сяджу у чытальнай зале праз два рады ад Валі, думаю, што рабіць. І невядома, ці быў-бы я тады у кінотэатры, каб аднекуль не падвярнууся Іван Сельскі—аднакурснік і сусед па пакою.

— Чаго сумуеш, а? Ведаю, ведаю. Відаць, да практычных і ты не гатоу. У мяне гэта не навіна. Алс чаго думаць, гараваць. Да экзаменау яшчэ амаль цэлы месяц! Усёроуна, вучы ці не вучы, а прафесарам не станеш. Далей раённай нікуды не трапіш. Гуляй, брат, пакуль гуляецца. Пападзеш пасля заканчэння у глуш, там прыкрыецца усё: не станцуеш пачалавечаму, не пагаворыш ні з кім. А пісаць ужо можам і так.— Іван выняу з кішэні свежы нумар газеты.—Бачыу? Падвальчык які дау. Эх, скарацілі рублёу на сорак. Ну, а так, як думаеш, усё-ж сотні чатыры будзе? То-та-ж! Умець трэба. Адзін факт, а шапка фантазіі. І будзе за што...—Іван пстрыкнуу сабе па падбародку.

«Падвальчык» Івана мяне мала цікавіу, як не цікавла і яго стракатая модная вопратка, і поусанты-метровыя вусікі. Час ішоу, і я баяуся, што магу спазніцца у кіно, а гэта для мяне было зусім нежадана. А Іван мог мне дапамагчы, бо я не раз чуу, як з яго смяяліся хлопцы, нібы ён амаль штовечар праводзіць новую дзяучыну. Расказвалі, што падлабуньвауся да афіцыянтак, буфетчыц, адной-чы нават на будаунічы участак ездзіу. Хоць і не хацелася адкрываць яму тайну, але колькі-ж можна цярпець так, чакаць невядома чаго? І я папрасіу Іван дапамагчы мне, колькі гэта у яго сілах.

— Запрасіць? Гэта дробязь. Толькі ты мне сотню, брат, пазыч. Учора сяброу суустрэу у рэстаране, прышлося клюнуць за суустрэчу. Без капейкі застауся. Дзён праз дзесяць ганарар атрымаю, адразу-ж аддам,—Іван молячы паглядзеу на мяне і, упэуніушыся, што пазыка будзе, працягнау:—Табе дауно пара да дзяучат прывыкаць. Дзяучына—гэта-ж поужыцця чалавека. Адстаеш ты... Толькі, брат, дзяучаты любяць грошы. Без грошай мы перад імі—ноль без палачкі.—Апошнія словы ён пацвердзіу неакрэсленым жэстам рукі і дадау:—Кладзі сюды білеты і аб астатнім можаш не клапаціцца. Праз поугадзіны будзеш сядзець з Валяй і напяваць любоуныя тралі-валі. Толькі-ж пра сотню не забудзь.

Калі я паказау, каго ён павінен запрасіць, Сельскі прашаптау:
— Дык гэта-ж Валя, Інкі сяброука. Вабная дзяўчына, год назад сам за ёй страляу,—і, падняушыся з-за століка, пайшоу да Валі.

Праз хвіліну ёй ужо прысеу ля Валі, а праз другую—канваіраваў яе па чытальнай зале, накіроуваючыся да дзвярэй. Праходзячы пауз мяне, многазначна падмыргнуў, паказаву палец: «Справы на пяць, значыць, з прысыпачкай».

Усё адбылося хутка і без усялякіх цяжкасцей, і я пазайздросціу Іванаваму спрыту і умельству у абыходжанні з дзяўчатамі.

Пачакаушы мінут пяць, я пайшоу услед за імі. Зайшоу у кіназалу. Іван сядзеу з Валяй. Спачатку я думау, што ён устане і дасць мне месца каля Валі, аднак Сельскі нават не звяртау на мяне увагі, як быццам-бы мы з ім былі зусім незнаёмы. Ён аб нечым гутарыу з Валяй, ласкава ёй усміхауся. Яго твар, нягледзячы на поузмрок у зале, аж гарэу ад задаволенасці і радасці. Валя паглядала на мяне і смяялася. Відаць, Іван штосьці гаварыу і аба мне.

Увесь час я думау аб Валі, якая сядзела з Іванам. «Няўжо у яго хопіць сумлення свайго таварыша ашукаць?» — мучыла мяне думка.

З радасцю я ускочыу са свайго месца, калі на экране з'явілася доугачаканае «Канец фільма». Можа усё-ж Іван зразумее сэрца таварыша, выканае сваё абяцанне?

Я хутка дагнау Валю і Івана, якіх быу згубіу пры выхадзе. Яны ішлі, прытуліушыся адзін да другога, і аб нечым гаварылі.

Вялізная шэрая кепка, нібы шапка старога падгніушага грыба, спаузла на самыя вушы Івана, каунер асенняга палітo быў прыузняты. Як толькі я наблізіуся да іх, Валя насмешлівым тонам папярэдзіла Івана, ды так, каб і мне было чутна:

— Цішэй тут. А то у газету напіша. І так ледзь упрасіла, каб не пісаў...—і яна хіхікнула.

— Журналісты не такія, каб абы куды пісаць. Ганарар нам патрэбен, як паветра. Хіба на стыпендыю пражывеш? А з ганарарам і клюнеш калі стограмоуку, і купіш што-небудзь.

— Дык ён і не напісау пра нас, бо ганарару няма ў шматтыражцы?—зноу пачуу я голас Валі.

— Вядома, у нашай краіне любая праца павінна аплачвацца. Сумеу зарабіць—расходуй як хочаш. Усе цяжкасці—дастаць грошы. Без грошай...—Іван не дакончыу, бо Валя вырвалася ад яго.

— Я думала, ты хоць крышку перамяніуся. А ты...—І Валя, сярдзіта стукаючы каблучкамі па тратуары, пачала аддаляцца ад Івана. Ён пабег за ёй.

Далей ісці і бачыць гэтую непрыемную сцэну я не мог і, крышачку запаволіушы хаду, перайшоу на другі бок вуліцы.

... Хлопцы ў пакоі ужо спалі. Распрануушыся, я лёг. У галаву лезлі розныя думкі.

Неузабаве дзверы адчыніліся, і, як вецер, у пакой ускочыу Іван—чырвоны, успацелы, хоць на дварэ быу мароз.

— Ну, яшчэ не спіш?—адразу-ж вярнууся ён да мяне.—Ну і дзяучына. Ледзь уціхамірыу. Не любіць яна нас. Ганараршчыкі, кажа. Хоць-бы крышку горад пауздзейнічау на яе. Дык не—такая-ж, як і год назад. Нават моды прайшлі міма. А вось Іна хутка увайшла у жыццё горада, гаспадаром сябе і тут адчувае. Нічога у цябе, брат, з Валяй не выйдзе. Кідай адразу.

Гэтыя словы мяне пакрыўдзілі да глыбіні душы.

— Іван, — перавёушы дыханне, вымавіу я,—мы з табой ніколі не спрачаліся, давай і не будзем спрачацца. Ты пакрыудзіу і мяне, і Валю. Але чорт з табою! Не хачу больш слухаць тваіх слоу.

— Што? Ды ты з глузду з'ехау, ці што? За што ты так злуешся? За тое, што Валю правесці хацеу? Дык яна-ж мяне прагнала. Як сабаку праганяюць з дому. Табе-ж, галава, хацеу дапамагчы. Не выйшла. Ды ты не бядуй. Не з такімі пазнаёмлю.

— Сціхні, а то не так з табою пагавару,—і, усхапіушыся з ложку, не на жарты раззлаваны, я ледзь не учапіуся рукамі за шэры піжак Івана.

Гэта, відаць, падзейнічала на яго больш, чым мае словы, бо ён раздзеуся, выключыу святло і ціхенька лёг, не склаушы нават сваіх штаноу-дудачак, якія адмыслова складау заусёды.

Пакрыуджаны, я доуга не мог заснуць. Усплывалі розныя думкі, успаміналася старое. Івана некалькі разоу прасілі напісаць артыкул у шматтыражку, а ён не напісау. Ён нічога не робіць у насценнай газеце, хаця член рэдкалегіі. Успомніліся мне і адносіны да Івана дзяучат на курсе, частыя спрэчкі хлопцау у пакоі...

Пасля гэтага вечара я зусім адышоу ад аднакурснікаў. Баяуся, што хлопцы даведаюцца аб маёй размове з Іванам і будуць смяяцца.

Пачаліся экзамены. З Іванам усе гэтыя дні я не размауляу. Валю сустракау рэдка, а калі і сустракау, нават не вітауся. Мне было соромна глянуць ёй у вочы.

Неяк ішоу я па калідоры у надзеі сустрэць аднакурснікаў, каб распытаць аб кансультацыі, і убачыу каля аднаго акна Іну у стракатай, у кубічкі, сукенцы і чырвоных, з тоустай падэшвай, туфлях. Яна кагосьці чакала. Раптам адчыніліся дзверы аудыторыі—і адтуль выбегла Валя.

— Ну, доуга цябе «лавіу»? —чую голас Іны.

— Што ты? Проста пытау, як і ва усіх.

— А што паставіу?

— Выдатна.

— А мне тройку... Усё чагосьці прыдзірауся. Ды мне нечага бядаваць. Я-ж замуж выходжу. За Івана.

Твар Валі раптам спахмурнеу. У гэты момант, нібы з вады, вынырнуу Іван Сельскі.

— Дзяўчаты—у кіно. Пасля экзамена трэба прасвяжыць галаву. Так, здаецца, гаворыць медыцына, Іна?—І, не атрымаушы адказу, ён падбег да мяне, сунуу ў руку нейкую паперку і білет.

— Дык, значыць, ідзем,—Іван паімкнууся быў да дзяучат, але Валя, закрыушы твар рукамі, пабегла у канец калідора

— Валя, што з табой?—усхвалявана ускліknула Іна.

— Эт, глупства. Я неяк з ёй паспрачаўся... капрызы,—за Валю адказаў Іван.—Пайшлі,—і, узяушы пад руку Іну, пайшоу да гардэроба.

Я раскрыу паперку. У ёй было напісана карандашом: «Не дуйся. Давай ідзі за намі. Усё прадугледжана і дамоулена. Дзейнічай!». Тут стаяу вялікі абнадзейваючы клічны знак, далей ішла прыпіска меншымі літарамі: «Ганарар у кішэні. Калі раней прыдзеш, падрыхтуй, што зможаш. Трэба замачыць».

Запіска і білет пяклі мне руку, нібы трымау я не паперу, а толькі што выгарнуты з печы жар. Разарваушы іх, я са злосцю шпурнуу кавалкі ў сметніцу. Дык вось які Іван—мой аднакурснік! Дык вось хто «гаспадаром» адчувае сябе у горадзе. Чаму мы не бачыли іх раней?

Смеласць прышла да мяне сама, і я пайшоу да Валі, якая стаяла у дальнім канцы калідора. Яе вусны шапталі:

— З кім пайшла... За каго думае выходзіць замуж... Нягоднік...

Я бачыу, што нам трэба пасапраўднаму пагаварыць з ёю, і пагаварыць аб многім.

Барыс САЧАНКА.

Мінскі гарадок, біякорпус, пакой 62, тэл. 2-07-19 В. а. рэд. П. СІЛІВАНЧЫК

Тыраж 2000